■ Саюзная дзяржава

# ЗГУРТАВАНАЯ МОЛАДЗЬ

**У сталіцы прадстаўнікі маладзёжных арганізацый Саюзнай дзяржавы вызначалі магчымасць умацавання стасункаў. Міжнародная канферэнцыя «Моладзь і міжнароднае супрацоўніцтва: вопыт узаемадзеяння Расіі і Беларусі» — першы значны крок для стварэння адзінай маладзёжнай палітыкі. Канферэнцыя праходзіла напярэдадні Дня яднання народаў Беларусі і Расіі, што адзначаецца 2 красавіка.**

Саюзная дзяржава адыграла вялікую ролю ў развіцці інтэграцыйных працэсаў. Беларусь і Расія прайшлі этап фарміравання Мытнага саюза, адзінай эканамічнай прасторы, з 1 студзеня 2015 года запрацаваў ЕАЭС. Працягвае ажыццяўляцца гарманізацыя заканадаўстваў у эканамічнай сферы, бюджэтнай і крэдытнай палітыцы. Акрамя таго, эфектыўна ажыццяўляецца ўзаемадзеянне ў пытаннях знешняй палітыкі і ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва. Аднак, па словах **Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Расіі ў Беларусі Аляксандра СУРЫКАВА**, паміж краінамі пакуль што адсутнічае стратэгічная вось узаемадзеяння ў рамках маладзёжнага супрацоўніцтва.

«Мы разлічваем, што ўдзельнікі канферэнцыі прадставяць свежыя думкі для каардынацыі маладзёжнай палітыкі дзвюх дзяржаў і фарміравання адзінага разумення ў гэтай сферы. Беларусь і Расія павінны надаваць вялікую ўвагу пытанням маладзёжнага супрацоўніцтва, бо ад дзяржаўнай палітыкі ў гэтай сферы залежыць будучыня краін», — адзначыў Аляксандр Сурыкаў.

Прадстаўнікі маладзёжных супольнасцяў Беларусі і Расіі падчас канферэнцыі абменьваліся думкамі, уносілі свае прапановы па эфектыўнай каардынацыі адзінай маладзёжнай палітыкі Саюзнай дзяржавы.

**Старшыня Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі» Сяргей КАНДЫБОВІЧ** адзначыў, што правядзенне падобнай міжнароднай канферэнцыі з'яўляецца своечасовым з прычыны таго, што пытанні, звязаныя з патрыятызмам, сёння становяцца ўсё больш актуальнымі.

«Моладзь павінна разумець, што наша будучыня залежыць ад таго, як мы сёння праявім свае лепшыя грамадзянскія патрыятычныя якасці», — падкрэсліў Сяргей Кандыбовіч.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

# АДНОСІНЫ РАЗВІВАЮЦЦА

## У тым ліку і ў эканамічным кірунку

**Больш выкарыстоўваць беларуска-расійскія магчымасці і абавязкова ўступаць у Сусветную гандлёвую арганізацыю. Такія прапановы зрабіў Аляксандр СУРЫКАЎ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь, падчас прэс-канферэнцыі да Дня яднання народаў нашых краін.**

### ГРАШОВАЕ ВЫМЯРЭННЕ

— За апошнія дваццаць гадоў тавараабарот Беларусі і Расіі вырастаў ад 5 мільярдаў долараў да амаль 44 мільярдаў (2012 год), гэта амаль у 9 разоў, — кажа пасол. — Такія статычныя лічбы, але за імі — развіццё вытворчасці, прамысловасці, сельскай гаспадаркі. Гэта мільёны працоўных месцаў. На долю экспарту Беларусі ў Расію прыпадае да 60% тавараабароту, зараз — каля 50%.

Але, на жаль, у мінулым годзе узаемны тавараабарот знізіўся да 30 мільярдаў долараў. «Гэтаму ёсць аб'ектыўныя прычыны, — удакладніе Аляксандр Сурыкаў, — падзенне цэн на сусветных рынках на энерганосьбіты, харчовыя і ўвогуле на ўсе сыравінныя прадукты. Плюс дэвальвацыя беларускага і расійскага рубля, што таксама ў пераліку на долары зніжае тавараабарот. Але калі глядзець на фізічныя аб'ёмы, то тут падзення амаль што няма, нават ёсць пэўны рост паставак, напрыклад, у харчовай сферы».

### ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ СВАЕ РЭСУРСЫ

Пасол задаецца пытаннем, што яшчэ можна зрабіць для паляпшэння эканамічнага супрацоўніцтва з улікам сённяшняй эканамічнай сітуацыі? Маючы на ўвазе, што рынак беларускі і расійскі «ў вялікай ступені акупаваны вытворчасцю не нашых краін». «Расія на 50% на сваім рынку мае не ўласныя вырабы, Беларусь — да 30%. Што можна зрабіць у інтэграцыйных працэсах, каб больш пазіцый заняць на сумесным рынку расійска-беларускім і еўразійскім?» — пытаецца Аляксандр Сурыкаў.

На яго думку, Беларусь і Расія мусяць болей імкнуцца да развіцця кааперацыі і інтэграцыі вытворчасці. Дзевяць гадоў таму была распачата адпаведная праца. Амаль 8000 беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў задзейнічаны цяпер у кааперацыйных сувязях. Больш за 2,5 тысячы расійска-беларускіх прадпрыемстваў працуюць на тэрыторыі Расіі, 1,3 — у Беларусі. Колькасць зборачных прадпрыемстваў у Расіі — амаль 40.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Знешняя палітыка

# Калі пашпарт — «мінулае стагоддзе»

## Грамадзяне Украіны змогуць уязджаць у нашу краіну па розных дакументах

**Учора ў Мінску прайшлі беларуска-ўкраінскія кансультацыі па Пагадненні паміж урадам нашай краіны і Кабінетам Міністраў Украіны аб бязвізавых паездках грамадзян ад 12 чэрвеня 2009 года. Як паведаміў на чарговым брыфінгу Дзмітрый МІРОНЧЫК, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС, на парадку дня — прымяненне гэтага Пагаднення і яго карэкціроўкі ў тым, што тычыцца пераліку сапраўдных дакументаў для ўезду-выезду, праезду транзітам і знаходжання на тэрыторыі нашай дзяржавы грамадзян Украіны.**

— Неабходнасць такой карэкціроўкі абумоўлена ўніфікацыяй патрабаванняў, што прад'яўляюцца да праязных дакументаў у адпаведнасці з нормамі ІКАО (Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай авіяцыі. — **Рэд.**) і ўдасканаленнем парадку перасячэння Дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь, — звярнуў увагу прадстаўнік МЗС.

Па словах Дзмітрыя Мірончыка, практыка прымянення згаданага Пагаднення сведчыць, што большасць грамадзян Украіны выкарыстоўваюць для перасячэння беларуска-ўкраінскай мяжы ўнутраны пашпарт грамадзяніна Украіны. У той жа час звесткі пашпарта не адпавядаюць патрабаванням міжнародных стандартаў, а таксама маюць слабыя ступені абароны ад падробак.

— З-за адсутнасці ва ўнутраным пашпарце грамадзяніна Украіны машынасчытваемай зоны, унясенне звестак аб яго ўладальніку ажыццяўляецца пагранічнымі службамі Рэспублікі Беларусь выключна ў ручным рэжыме, што негатыўна ўплывае на прапускную здольнасць дзеючых на беларуска-ўкраінскай мяжы пунктаў пропуску, якасць абслугоўвання насельніцтва, прыводзіць да затрымак афармлення транспартных сродкаў, — зазначыў прэс-сакратар МЗС.

У той жа час увядзенне Украінай замест такіх пашпартоў пластыкавых ID-картак не прадугледжвалася бакамі пры падпісанні Пагаднення ў 2009 годзе. У сувязі з гэтым уведзены ўкраінскімі ўладамі з пачатку гэтага года ўнутраны пашпарт не разглядаецца ў нашай краіне як дакумент, сапраўдны для перасячэння мяжы.

Адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды», якое выйсце бачыць міністэрства з гэтай сітуацыі, Дзмітрый Мірончык паведаміў:

— Натуральна, мы не будзем прапаноўваць нашым украінскім калегам вярнуцца да пашпартоў старога ўзору — таксама з той нагоды, што тыя пашпарты не адпавядаюць нормам ІКАО, як я ўжо казаў. У іх няма машынасчытваемай зоны, а гэта — «мінулае стагоддзе». Я спадзяюся, што бакі знойдуць выйсце. Тым больш што пагадненне аб бязвізавых паездках грамадзян дзвюх краін прадугледжвае шэраг магчымасцяў для наведвання беларусамі Украіны і ўкраінцамі Беларусі на падставе рознага кшталту дакументаў. Унутраныя пашпарты — гэта толькі адзін з тыпаў дакументаў, на базе якіх можна перасякаць мяжу. Таксама гэта можна рабіць на базе пашпартоў, якія прызначаны для паездак за мяжу. Гэтыя пашпарты ва Украіне таксама існуюць.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# УЛАДА АДКАЖА НА ПЫТАННІ

**У краіне арганізавана правядзенне аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прамых тэлефонных ліній у мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў людзей. Такая форма зносін паміж уладай і жыхарамі краіны стартавала ў студзені 2015 года, і яны рэгулярна праводзяцца па суботах.**

**2 красавіка з 9.00 да 12.00 вам адкажуць:**

КЛЕЦ Андрэй Анатолевіч, намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама 80162213121

МАЦКЕВІЧ Алег Сяргеевіч, намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама 80212222222

БАРЫСЕНКА Алег Леанідавіч, старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў 80232751237

ДЗЯШКО Уладзімір Іосіфавіч, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама 80152735644

НЕКРАШЭВІЧ Віктар Уладзіміравіч, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама 80222501869

ЛІПНІЦКІ Іван Эдуардавіч, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў 5004160

ЛАПЦЕЎ Віктар Сяргеевіч, намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама 2224444

### СУСТРЭЧА НЕРАЎНАДУШНЫХ

**У суботу пад эгідай маладзёжнага валанцёрскага руху БРСМ «Добрае сэрца» ва ўрочышчы «Тумель» Смалявіцкага раёна пройдзе дабрачыннае адкрытае міжрэгіянальнае спартыўнае спаборніцтва па аўтаспорце. Адбудзецца яно ўпершыню.**

Да ўдзелу ў спаборніцтвах дапускаюцца ўсе ахвотныя экіпажы ва ўзросце больш за 18 гадоў. Спартсмены будуць змагацца за прызавыя месцы ў дзвюх катэгорыях — «джыпы (пазадарожнікі)» і «квадрацыклы». Прадугледжана таксама і трэцяя — «Экіпаж з дзецьмі», бо мерапрыемства будзе адрозніваць ад падобных сямейная атмасфера, дух таварыскасці і братэрства. Таму арганізатары ўпэўнены, што пераможцам стане не мацнейшы, а дабрэйшы экіпаж.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

**ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Дзявятая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання пачне сваю працу 4 красавіка 2016 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала).**

**Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 4 красавіка 2016 года з 09.15 да 09.50 у фае залы пасяджэнняў.**

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**4 красавіка 2016 года ў 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне адзінаццатай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць спачуванні ў сувязі са смерцю народнага паэта Беларусі, дэпутата Вярхоўнага Савета БССР XI склікання і Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь XII склікання Ніла ГІЛЕВІЧА яго родным і блізкім.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

## Организатор: Волосовичский сельский исполнительный комитет

| № лота | Местонахождение земельного участка | Площадь га, кадастровый номер | Условия и организация | Расходы по подготовке и изготовлению документов (руб.) | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| У-5 | д. Каминщина Лепельского района | 0,1486 га Кадастровый номер 222780404101000019 | - водоохранная зона озера Турицкое; - расположен в охранной зоне линий электропередачи | 4 391 115 | 8 000 000 | 1 600 000 |

1. **Аукцион состоится 4 мая 2016 года в 11.00 по адресу: Витебская область, Лепельский район, д. Новые Волосовичи, улица Центральная, дом 17.**

2. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: д. Новые Волосовичи, улица Центральная, дом 17, Волосовичский сельский исполнительный комитет.

**Последний день приема заявлений – 2 мая 2016 года до 17.00.**

3. К участию допускаются граждане РБ, подавшие заявление установленной формы, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Волосовичского сельисполкома № 3641319031032 в филиале №211 ЦБУ №214 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 660, УНП 300039732, назначение платежа 04901, задатка в размере 20% от начальной цены объекта аукциона.

4. Для участия в аукционе необходимо предоставить копию документа, подтверждающую личность покупателя, представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, удостоверяющую личность, а также предъявляется паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

5. Оплата стоимости предмета аукциона, расходов по организации и проведению аукциона, за публикацию в средствах массовой информации и расходов по подготовке и изготовлению документации, подлежащих возмещению победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о передаче в частную собственность победителю аукциона земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельным участком в натуре.

Контактные телефоны: 8(02132) 6-39-63; 6-11-99; V 8-0291-333-105.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует, что с 01.04.2016 прекращен прием денежных средств на срочный отзывный банковский вклад «Гарантированный доход» сроком на 35 дней.

Процентная ставка по срочному банковскому вкладу «Гарантированный доход» сроком на 35 дней установлена в размере 0,5% годовых.

Установленный размер процентов применяется с даты автоматического перезаключения на новый срок начиная с 01.04.2016.

**ОАО «АСБ Беларусбанк» дополнительно сообщает, что с 01.04.2016 по срочному банковскому вкладу «Специальный накопительный счет» установлена процентная ставка досрочного возврата в размере 0,5% годовых.**

Установленный размер процентов применяется с даты автоматического перезаключения на новый срок начиная с 01.04.2016.

**Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»**

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.
**Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов)**